алімпіец
ЗВЯЗДА
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь



## Алег ШЭПЕЛЬ:

# «СУСВЕТНЫ ПАРАЛІМПІЙСКІ РУХ МНОГАЕ СТРАЦІЎ АД НАШАЙ ІЗАЛЯЦЫІ»

**ГІСТОРЫЯ паралімпійскага спорту — паказчык развіцця краіны, яе прагрэсу, адкрытасці грамадства. Інклюзіўная адукацыя, безбар'ернае асяроддзе, сацыяльная адаптацыя інвалідаў — самыя відавочныя пытанні, звязаныя з развіццём паралімпійскага руху. Узначальваць паралімпійскі рух — значыць адказваць за ўсё і ўсіх. З гэтай задачай больш за 20 гадоў спраўляецца Алег Шэпель — чалавек, які стаяў каля вытокаў развіцця паралімпійскага спорту ў Беларусі. На Паралімпійскіх гульнях 1988 года на спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы ён заваяваў тры залатыя медалі, першыя паралімпійскія ўзнагароды ў гісторыі беларускага спорту.**
**За сваю спартыўную кар'еру Алег Шэпель стаў пяціразовым чэмпіёнам і тройчы бронзавым прызёрам Паралімпійскіх гульняў, чатырохразовым чэмпіёнам свету, шасціразовым чэмпіёнам Еўропы, 13 разоў аднаўляў сусветныя рэкорды. Таксама Алег Шэпель — самы малады заслужаны майстар спорту СССР у лёгкай атлетыцы. У 2001 годзе чэмпіён скончыў спартыўную кар'еру і ўзначаліў Нацыянальны паралімпійскі камітэт.**



Ігар Бокій, Ганна Канюк, Ядзвіга Скорабагатая, Васіль Шапцябой, Святлана Саханенка і многія іншыя беларускія спартсмены ўпісалі свае імёны ў гісторыю айчыннага паралімпійскага руху. Імі захапляліся, за іх радаваліся мільёны людзей па ўсім свеце. Але з'явіліся і тыя, хто вырашыў адабраць у паралімпійцаў справу іх жыцця. У лістападзе 2022 года на пазачарговай генеральнай асамблеі ў Берліне Міжнародны паралімпійскі камітэт (МПК) прыняў рашэнне аб прыпыненні членства Паралімпійскіх камітэтаў Расіі і Беларусі. Прычынай адхілення МПК назваў «няздольнасць выконваць абавязацельствы па членстве ў адпаведнасці са Статутам МПК». За гэтымі сухімі словамі стаіць лёс 98 членаў беларускіх нацыянальных і зборных камандаў па паралімпійскіх відах спорту, якіх у Беларусі 14 (для нашай невялікай краіны — красамоўная лічба). Але апусціць рукі і здацца на волю лёсу — не для паралімпійцаў. Яны так ніколі не рабілі і рабіць не будуць. А што будуць рабіць і як далей будзе развівацца паралімпійскі спорт у Беларусі, «Звяздзе» расказаў Алег Шэпель, якога ў пачатку студзеня пераабралі на пасаду старшыні Нацыянальнага паралімпійскага камітэта.

***— Алег Аляксандравіч, самае злабадзённае пытанне. Як вырашаецца праблема з прыпыненнем членства нашага паралімпійскага камітэта ў Міжнародным камітэце?***

— Сумесна з юрыстамі, спецыялістамі Міністэрства юстыцыі і Міністэрства замежных спраў мы падрыхтавалі дакумент, дзе ў 27 пунктах абгрунтавалі, што мы не парушылі ні аднаго пункта Канстытуцыі Міжнароднага паралімпійскага камітэта, не парушалі Алімпійскую хартыю, этычныя нормы. На жаль, падвойныя стандарты, пра якія сёння так шмат кажуць, дайшлі і да паралімпійскага спорту. Я ўжо неаднаразова казаў, што калі раней спорт быў проста з элементамі палітыкі, то цяпер цалкам стаў палітыкай, што зусім не радуе. Спорт павінен не раз'ядноўваць, а аб'ядноўваць, асабліва людзей з абмежаванымі магчымасцямі. На пазачарговай асамблеі Міжнароднага паралімпійскага камітэта, дзе было прыпынена наша членства, са 184 краін прысутнічалі толькі 117 дэлегацый. З іх 54 прагаласавалі супраць нас, 45 — за. А яшчэ 16 устрымаліся, пераважна краіны Лацінскай Амерыкі, якім паабяцалі фінансавую падтрымку. І, што самае цікавае, на асамблеі не прысутнічалі краіны постсавецкай прасторы, дэлегацыям якіх не далі візы. Думаю, постсавецкія краіны нас падтрымалі б і праўда была б на нашым баку.

Сёння абмяркоўвацца прапанова аб тым, што выканкам Міжнароднага паралімпійскага камітэта можа прымаць любыя рашэнні аб дыскваліфікацыі спартсменаў, трэнераў, нацыянальных паралімпійскіх камітэтаў без тлумачэння прычын. Гэта ж беззаконнасць! Яны разумеюць, што парушылі ўсе нормы і зараз ім патрэбен дакумент, які будзе гэта апраўдваць. Мы падалі апеляцыю ў трыбунал Міжнароднага паралімпійскага камітэта. На працягу трох месяцаў яны павінны стварыць камісію, якая будзе разглядаць нашу апеляцыю. Але мы разумеем, што з гэтым яны будуць цягнуць да апошняга. Зараз мы на свае вочы назіраем раскол у сусветным паралімпійскім руху. Некаторыя краіны нас падтрымліваюць: Азіяцкі паралімпійскі камітэт, Катар, Саудаўская Аравія, нават Латвія за нас. Усе разумеюць, што без расійскіх і беларускіх паралімпійцаў узровень чэмпіянатаў Еўропы і свету, Паралімпійскіх гульняў зніжаецца. А гэта ўплывае на колькасць тэлегледачоў, рэкламнае супрацоўніцтва, на чым завязаны фінансавыя паступленні. Вядома, ім гэта нявыгадна. Але, я думаю, калі прынялі такое рашэнне, значыць, нехта грошы падкідвае. Для даведкі: штаб-кватэра Міжнароднага паралімпійскага камітэта знаходзіцца ў Боне на тэрыторыі Вышэйшага пасольства ЗША.

Пакуль мы чакаем, што дасць наша апеляцыя ў трыбунал МПК. Затым, магчыма, прымем рашэнне аб падачы іску ў суд Германіі па месцы знаходжання МПК. Нямецкія адвакаты, якія займаюцца спартыўнымі арбітражнымі справамі, кажуць, што ў нас высокая верагоднасць перамогі.

***— Як у гэтых умовах адчуваюць сябе спартсмены?***

— Яны трэніруюцца, ніхто не апусціў рукі. Спорт — сэнс іх жыцця. Яны праз спорт даказваюць, што паўнавартасныя члены грамадства, запатрабаваныя, паспяховыя. Таму матывацыі ў іх хапае. У нас расце моцная перспектыўная моладзь. Цяпер можам спакойна прайсці змену пакаленняў у нацыянальных камандах, узмацніць іх. Мы супастаўляем вынікі, якія нашы спартсмены паказваюць, з вынікамі міжнародных стартаў. На адкрытым чэмпіянаце Беларусі па плаванні нашы спартсмены ўстанавілі шэсць сусветных рэкордаў. Гэта яркае сведчанне таму, што сусветны паралімпійскі рух сапраўды многае згубіў ад нашай ізаляцыі.

***— Але ў зімовых відах ужо другі сезон праходзіць без міжнародных стартаў. Для спартсменаў гэта адчувальна...***

— Я сустракаўся з міністрам спорту Расіі Алегам Матыцыным, прэзідэнтам Паралімпійскага камітэта Расіі Паўлам Ражковым. Мы выпрацавалі кірункі, па якіх будзем працаваць. Ужо вярстаецца каляндар сумесных спаборніцтваў Беларусі і Расіі. Найбліжэйшы турнір па лыжных гонках і біятлоне ў лютым прыме Беларусь. Плануем яго правесці ў Мінску ці ў Лагойску. Магчыма, матывацыя спартсменаў будзе не такой як, напрыклад, на чэмпіянаце свету. Але гэты перыяд трэба перажыць. У рэшце рэшт любая вайна заканчваецца мірам.

***— Для правядзення турніраў патрэбна безбар'ернае асяроддзе. У якім стане яно на нашых спартыўных аб'ектах?***

— У тых жа Раўбічах нядрэнныя ўмовы. Не скажу, што ўсё ідэальна, але паралімпійцам там зручна. У Брэсце выдатны басейн з гасцінічным комплексам, кафэ. Адзіны невялікі недахоп — не хапае ліфту, каб спартсмен мог з кафэ перайсці ў спартыўны комплекс. Але губернатар Брэсцкай вобласці Юрый Вітольдавіч Шулейка запэўніў, што сёлета гэта праблема будзе вырашана. Калі прыязджалі расійскія спартсмены, асабліва з невялікіх гарадоў, захапляліся тым узроўнем універсальнага асяроддзя, што ёсць у Беларусі, пачынаючы з аэрапорта і чыгуначнага вакзала.

***— Які ўдзел у стварэнні безбар'ернага асяроддзя бярэ Нацыянальны паралімпійскі камітэт?***

— У гэтай справе актыўны ўдзел прымае грамадскае аб'яднанне інвалідаў. Створаны міжведамасны савет па правах інвалідаў пад кіраўніцтвам намесніка прэм'ер-міністра Ігара Петрышэнкі. Раз на квартал мы збіраемся ў пэўным рэгіёне і абмяркоўваем найбольш актуальныя праблемы, у тым ліку і безбар'ернае асяроддзе. Адно з самых важных дасягненняў — у будаўнічнае заканадаўства ўключаны нормы, якія патрабуюць каб толькі пабудаваныя аб'екты ці адрэстаўрыраваныя абавязкова былі з універсальным асяроддзем. Праект ні аднаго жылога дома, ні аднаго спартыўнага, медыцынскага, культурнага і іншага аб'екта не будзе зацверджаны, калі там не будзе створана стопрацэнтнае ўніверсальнае асяроддзе. Апошні з такіх станоўчых прыкладаў — новая паліклініка ў Гомелі, дзе створаны выдатныя ўмовы, каб кожны чалавек адчуваў сябе камфортна.

***— Нягледзячы ні на што, паралімпійскаму спорту патрэбен рэзерв. Ці дастаткова якасна ў краіне працуюць секцыі для дзяцей з інваліднасцю?***

— Мы ўдзяляем гэтай рабоце асаблівую ўвагу. Нашы спартсмены рэгулярна праводзяць майстар-класы, каб дзеці разумелі нюансы паралімпійскага спорту. У мінскай школе № 12 адкрыты музей паралімпійскай славы. У Гомельскай і Магілёўскай абласцях трэнеры ўжо самі шукаюць дзяцей-інвалідаў, каб з імі працаваць. Не заўсёды бацькі разумеюць, як гэта важна для дзіцяці, некаторыя баяцца, што спорт можа нашкодзіць. Але пасля выступлення нашых спартсменаў на буйных стартах колькасць дзяцей і падлеткаў з інваліднасцю ў спартыўных секцыях узрастае. У Бабруйску працуе адпаведная секцыя па плаванні, у Магілёўскай спартыўнай школе прафсаюзаў «Спартак» дзейнічае аддзяленне па лыжах для паралімпійцаў. У Гомелі ёсць цэнтр паралімпійскіх і дэфлімпійскіх відаў спорту са сваёй нядрэннай базай. Наша лёгкаатлетка Ганна Канюк трэніруе дзяцей у Гродне, а ў Маладзечне — Ігар Фартунаў. У Віцебску трэнер Алег Кірылаў арганізаваў групу па міні-футболе для невідушчых. Мы імкнёмся, каб ва ўчылішчах алімпійскага рэзерву былі інтэграваныя групы, дзе, спартсмены-паралімпійцы вучыліся б разам са здаровымі. Гэта дасць ім больш магчымасцяў для росту. Пакуль заканадаўчыя нормы такой магчымасці не даюць. Але гэта пытанне жадання кіраўнікоў. Не трэба мяняць заканадаўства — трэба проста адрэгаваць статут. Кіраўнікі спасылаюцца на адсутнасць безбар'ернага асяроддзя, але мы плануем накіроўваць туды спартсменаў, каму яно менш патрэбнае. Пакуль гэта пытанне не вырашаецца. А гэта сапраўды важна. Па сабе ведаю, што такі падыход заўсёды дае вынік. Па-першае, паралімпіец цягнецца за спартсменамі, якія ў нечым мацнейшыя, і такім чынам павышае сваё спартыўнае майстэрства. А па-другое, калі спачатку да паралімпійцаў ёсць пэўная насцярожанасць, то потым яны становяцца сябрамі. Гэта і ёсць інтэграцыя інваліда ў грамадства.

***— З дзецьмі зразумела, а як у сённяшніх умовах захаваць матывацыю і патэнцыял маладых спартсменаў, якім прыйшоў час паказваць высокія вынікі?***

— Думаю, у маладых спартсменаў нават больш матывацыі, чым у вопытных і вядомых. Зараз у іх ёсць магчымасць часцей выязджаць на спаборніцтвы. Калі раней фінанасаванне было накіравана ў асноўным на вядучых спартсменаў, то сёння мы можам дазволіць сабе вывозіць на спаборніцтвы больш моладзі. Падтрымліваем маладых спартсменаў матэрыяльна. Летась паралімпійцы атрымалі 22 стыпендыі ад Мінскага гарвыканкама і пяць стыпендый ад кіраўніцтва іншых рэгіёнаў. Сёлета нашым спартсменам прысуджаны 24 стыпендыі ад рэгіёнаў, за выключэннем Мінска. То-бок нашых спартсменаў усё актыўней падтрымліваюць рэгіёны. Наладжаны цудоўныя сувязі з Прэзідэнцкім спартыўным клубам. Усе нашы просьбы знаходзяць падтрымку. Сёлета 11 нашых спартсменаў — стыпендыяты Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Скардзіцца не даводзіцца. У свой час для мяне найлепшай матывацыяй былі дадатковыя 200 грамаў смятаны, а сёння — і стыпендыі, і інвентар, і зборы, і спаборніцтвы.

***— Калі чалавек з інваліднасцю не хоча будаваць спартыўную кар'еру, дзе яшчэ ён можа знайсці сваё прызнанне?***

— На прадпрыемствах Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. У нас 18 прадпрыемстваў разам з філіяламі: ва ўсіх абласных гарадах, а таксама ў Полацку, Оршы, Бабруйску, Мазыры, Пінску, Навагрудку, Слуцку, Маладзечне, Чэрвене, Барысаве. На прадпрыемстве працуе каля шасці тысяч чалавек. Беларусь — адзіная краіна на постсавецкай прасторы, якая захавала прадпрыемствы, дзе могуць працаваць інваліды па зроку. Сёння мы можам працаўладкаваць любога інваліда па зроку, і калі ён адзінокі і яму гэта трэба, выдзеліць месца ў інтэрнаце. Вядома, апошнія падзеі адбіліся і на нас — мы страцілі амаль 30 працэнтаў рынку (Украіна, Прыбалтыка, Польшча, Малдова, Румынія).